*М.А.БЯСПАЛАЯ*

# КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА НАРОДА ЯК АБ’ЕКТ І АХВЯРА ВАЕННЫХ КАНФЛІКТАЎ

*Прасочваецца эвалюцыя адносін да твораў культурнай спадчыны, якія з ваенных трафеяў на працягу стагоддзяў ператвараюцца ў паўнавартасных удзельнікаў ваенных падзей, у іх аб’ект і ахвяру.*

*Артыкул прысвечаны аналізу сітуацыі, якая склалася вакол матэрыяльных культурных каштоўнасцей, сканцэнтраваных у бібліятэках, музеях, архівах падчас нямецкай акупацыі тэрыторыі БССР у гады Вялікай Айчыннай вайны. Аўтар карыстаецца данымі камісіі “Вяртанне і захаванне нацыянальных культурных каштоўнасцей”, высновамі айчынных і нямецкіх даследчыкаў і паказвае трагічную долю многіх каштоўных твораў нашай спадчыны.*

Лёс культурных набыткаў чалавецтва ў час войнаў даўно з’яўляецца аб’ектам навуковых даследаванняў, праўда, перш за ўсё з пункту гледжання іх вяртання, ці рэстытуцыі. Асаблівая ўвага гэтай праблеме стала надавацца пасля Другой сусветнай вайны, у тым ліку і ў Рэспубліцы Беларусь. Актыўную работу ў дадзеным кірунку праводзіла камісія “Вяртанне і захаванне нацыянальных культурных каштоўнасцей”, створаная ў 1987 г., дзякуючы якой многія шэдэўры нашай культуры вярнуліся на радзіму. Вялікай заслугай камісіі з’яўляецца выпуск серыі зборнікаў дакументаў і архіўных матэрыялаў па праблеме пошуку і вяртання нацыянальных каштоўнасцей. Аднак, па словах А.І.Мальдзіса, камісія “Вяртанне...” ўстанавіла, апісала, каталагізавала толькі пяць працэнтаў таго, што было страчана ў гады Другой сусветнай вайны [6, с. 238].

У артыкуле пастаўлена задача прааналізаваць на падставе гістарычных фактаў ператварэнне культурнай спадчыны з аб’екта звычайнага грабяжу ў аб’ект дзяржаўнай ваеннай палітыкі і разам з тым у яе ахвяру, далейшы лёс якой залежыць ад узроўню культуры пераможцаў.

Культурная спадчына кожнага народа фарміравалася на працягу стагоддзяў. Яна выразна дэманстравала яго асаблівасці і самабытнасць у параўнанні з суседзямі, яго дасягненні і ўклад у супольную культуру як пэўнай эпохі, так і ў цэлым у сусветную культуру. Можна ўявіць, што ў перыяд “дзяцінства” чалавецтва каштоўнасцю валодалі самыя неабходныя утылітарныя рэчы, але па меры эвалюцыі людской супольнасці мянялася і ўяўленне як аб саміх культурных здабытках, так і аб іх каштоўнасці і значнасці. Мы не разглядаем у якасці аб’екта духоўныя каштоўнасці, хаця іх гістарычная рэтраспектыва пад вуглом зроку нашага артыкула была б дастаткова арыгінальнай. Аб’ектам нашага аналізу з’яўляюцца матэрыяльныя культурныя каштоўнасці.

Відавочна, што перш чым прызнаць пэўную рэч культурнай каштоўнасцю, чалавецтва павінна было дасягнуць адпаведнага ўзроўню развіцця. Для еўрапейскай цывілізацыі ў гэтым сэнсе вызначальным з’явілася развіццё навукі, розных галін мастацтва, літаратуры ў полісах Старажытнай Грэцыі. Падмурак яго, як прызнана ў пазнейшай навуцы, склалі культурныя дасягненні старажытных цывілізацый. Агульнавядома, якіх вышынь дасягнула грэчаская культура, аднак для рымскіх салдат, што з’явіліся на тэрыторыі Грэцыі ў II ст. да н.э., многае не ўяўляла каштоўнасці. У гістарычнай літаратуры прыводзіцца трагікамічны эпізод, звязаны з разбурэннем культурнага цэнтра Карынфа рымскімі легіянерамі. Пасля скаргі жыхароў, што легіянеры на карцінах, шэдэўрах грэчаскага мастацтва гуляюць у косці, камандзір, які дагэтуль лічыў іх звычайнымі размаляванымі дошкамі, загадаў салдатам: “Дошкі сабраць, пералічыць і даставіць у Рым. Калі прападзе хоць адна, вас маляваць прымушу”.

III–II стст. да н.э. сталі вызначальнымі для культурнага развіцця рымлян. У час ваенных паходаў яны сутыкнуліся з высокай і вытанчанай культурай Карфагена, грэчаскіх гарадоў-калоній на поўдні сучаснай Італіі, а потым і мацерыковай Грэцыі. У сваіх трыумфальных шэсцях рымскія военачальнікі пачалі паказваць не толькі натоўпы палонных і статкі жывёлы, але і іншыя трафеі: карціны, прадметы раскошы, навуковыя вынаходкі, напрыклад сонечны гадзіннік, якім яны, дарэчы, не ўмелі карыстацца. Нават

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

першая прыватная бібліятэка ў Рыме сфарміравалася з ваенных трафеяў, а да ўпрыгожвання горада помнікамі і статуямі таксама далучаліся трафеі рымскай зброі. Рымляне па праву пераможцаў цэлымі караблямі вывозілі помнікі мастацтва. Толькі пасля такога своеасаблівага назапашвання культурных здабыткаў суседніх народаў рымляне пачынаюць бурна развіваць амаль усе культурныя кірункі, і ў некаторых яны змаглі нават пераўзысці сваіх настаўнікаў.

Цывілізацыя Сярэднявечча таксама прайшла аналагічны шлях у адносінах да культурнай спадчыны. Варвары, разбурыўшы Заходнюю Рымскую імперыю, выкарыстоўвалі яе культурныя помнікі ў чыста утылітарных мэтах. Прыкладам можа быць Калізей. Матэрыял, з якога ён быў пабудаваны, заваёўнікі выкарыстоўвалі на пабудову свайго жытла. На шчасце, поўнасцю разабраць Калізей яны не паспелі. Затое праз многа стагоддзяў туркі ператварылі Парфенон у парахавы склад, і ў час выбуху найвялікшы сусветны шэдэўр быў моцна пашкоджаны.

Толькі ў эпоху Адраджэння пашыраюцца ўяўленні тагачаснага грамадства аб каштоўнасці ўсіх відаў культурных здабыткаў чалавецтва. Усё часцей трафеямі ваенных паходаў становяцца не толькі вырабы ювелірнага мастацтва, але і кнігі, карціны і нават іх аўтары. Можна адзначыць вядомы гістарычны факт аб перамяшчэнні некаторых культурных каштоўнасцей італьянскіх гарадоў у Францыю падчас так званых італьянскіх войнаў канца XV–XVI ст. Як пісаў знакаміты расійскі гісторык С.М.Салаўёў, французы “грабяжом і фанабэрыстасцю зневажалі народ”, а пасля паражэння “пакінулі абоз і велізарную здабычу...” [8, с. 109].

Культурныя здабыткі, захопленыя ці канфіскаваныя ў час ваенных дзеянняў, папаўнялі дзяржаўныя ці прыватныя зборы. Да прыкладу, багацейшая бібліятэка, якая фарміравалася на працягу стагоддзяў пачынаючы з 1600 г. некалькімі пакаленнямі Радзівілаў і налічвала больш за 20 тыс. тамоў на розных мовах, у 1772 г. па загаду расійскай імператрыцы Кацярыны II была вывезена ў Санкт-Пецярбург. Такім чынам быў пакараны Караль Станіслаў Радзівіл (Пане Каханку) за ўдзел у антырускай канфедэрацыі. Яшчэ адзін яскравы прыклад – лёс Радзівілаўскага летапісу, упрыгожанага 617 малюнкамі. Летапіс так названы таму, што належаў вядомаму палітычнаму дзеячу, уладару Слуцка Багуславу Радзівілу, аднак хутчэй за ўсё сам уладальнік перадаў яго ў бібліятэку г. Кёнігсберга. Праз сто гадоў, калі ў час руска-прускай вайны горад быў узяты рускімі войскамі, Радзівілаўскі летапіс у якасці трафея быў перададзены ў бібліятэку Расійскай акадэміі навук [11, с. 124–125].

Пільную ўвагу адбору культурных каштоўнасцей у заваяваных краінах надаваў імператар Францыі Напалеон Банапарт. Ужо ў час першых яго італьянскіх паходаў з поўначы Італіі было вывезена шмат каштоўнасцей, якія папоўнілі Луўр. Аднак пасля заканчэння напалеонаўскіх войнаў усё захопленае давялося вярнуць на радзіму. Вядомы факт аб перамовах знакамітага італьянскага скульптара Кановы па праблеме вяртання такіх сусветных шэдэўраў, як “Паміраючы гладыятар”, “Апалон Бельведэрскі”, “Венера Медычы” [9, с. 86]. Пасля вяртання культурных каштоўнасцей у краіны паходжання залы Луўра прыметна апусцелі, і толькі з’яўленне ў музеі Венеры Мілоскай, купленай у 1821 г., удыхнула новы імпульс у культурнае жыццё Парыжа.

Новыя падыходы да праблемы культурных каштоўнасцей, якія сталі ваеннымі трафеямі краіны-пераможцы і папоўнілі яе музеі і прыватныя калекцыі, пачалі хутка развівацца ў другой палове XIX ст. на хвалі выразнага развіцця нацыяналізму і стварэння нацыянальных дзяржаў. Перш за ўсё сказанае адносіцца да Італіі, якая пасля абвяшчэння нацыянальнай дзяржавай пачала патрабаваць ад Аўстра-Венгрыі вяртання свайго культурнага багацця – твораў мастацтва, гістарычных помнікаў і архіваў, якія былі вывезены аўстрыйскімі ўладамі ў пачатку XIX ст. з акупіраванай тэрыторыі Італіі [4, с. 22].

Заканчэнне Першай сусветнай вайны выклікала з’яўленне на карце Еўропы многіх нацыянальных дзяржаў: Чэхаславакіі, Венгрыі, Польшчы, Каралеўства сербаў, харватаў, славенцаў і інш. Ад краін, якія прайгралі вайну, перш за ўсё Аўстрыі, пераможцы патрабавалі вяртання культурных каштоўнасцей, захопленых не толькі ў час ваенных дзеянняў 1914–1918 гг., але і значна раней. Напрыклад, Італія склала пералік, дзе называліся каштоўнасці і медалі эпохі Медычы, карціны, скульптуры і рукапісы з Мадэны, рэгаліі з Палерма, архіўныя дакументы розных гарадоў і многае іншае. Самым старым

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дакументам, які італьянцы патрабавалі вярнуць, быў рукапіс 1718 г. з Неапаля. Чэхаславакія патрабавала вяртання твораў мастацтва і архіўных дакументаў, якія былі вывезены Габсбургамі. Польшча патрабавала вяртання толькі аднаго прадмета – залатой чашы Уладзіслава IV [4, с. 25].

Для ўшанавання культурнай спадчыны нашай краіны важнейшае значэнне мелі параграфы Рыжскага мірнага дагавора ад 18 сакавіка 1921 г. паміж Польшчай, Расіяй і Украінай. Як вядома, пры яго заключэнні прадстаўнікі Беларусі не прысутнічалі. Згодна палажэнняў дагавора Польшчы вярталіся культурныя каштоўнасці, якія сталі ваеннымі трафеямі, пачынаючы з першага падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 г. Польскі бок дакументальна аргументаваў 80 прэтэнзій, былі задаволены толькі 32. У Польшчу вярнуліся некалькі сотняў твораў мастацтва, напрыклад помнік князю Панятоўскаму работы Торвальдсена, частка бібліятэк Залускіх і Варшаўскага універсітэта, каралеўская калекцыя фламандскіх арасаў (габеленаў) з Вавельскага замка і інш. [4, с. 33]. Выразна, асобнымі словамі (expresses verbis) у дагаворы была звернута ўвага на прынцып аднаўлення цэласнасці культурнай спадчыны беларускага народа. Па гэтай прычыне не падлягалі вяртанню ў Польшчу культурныя каштоўнасці, якія знаходзіліся на ўсходзе ад польска-беларускай мяжы і ў свой час трапілі ў Польшчу не шляхам здзелкі ці па спадчыне, а былі захоплены.

У разрэзе нашай тэмы самая выразная карціна ствараецца пры аналізе сітуацыі, якая склалася вакол культурных каштоўнасцей у гады Другой сусветнай вайны, асабліва на акупіраванай тэрыторыі былога СССР. Даследчыкамі даказана, што паўнамоцтвы на вываз культурнай спадчыны атрымалі падраздзяленні вермахта, СС, СД, міністэрства замежных спраў, міністэрства ўсходніх тэрыторый на чале з А.Розенбергам. Пры рабаванні чужога багацця акупанты знішчалі ці вывозілі інвентарныя кнігі, каталогі, іншую дакументацыю. Надзвычайная дзяржаўная камісія СССР, створаная ў лістападзе 1942 г., зрабіла вопіс страт у галіне культуры, які склаў 21 том. Да 14 тома ўключна пералічваліся ўсе прадметы мастацтва, а з 15 – музейныя каштоўнасці гістарычных, краязнаўчых і іншых культурна-асветных устаноў. Па адных звестках, музеі акупіраванай часткі СССР згубілі 600 тыс. экспанатаў, па другіх – звыш 760 тыс. [7, с. 59]. На наш погляд, досыць выразна адносіны да культурных каштоўнасцей на савецкай тэрыторыі адлюстраваны ў загадзе “Аб паводзінах войскаў на Усходзе” аднаго з генералаў вермахта: “Войскі зацікаўлены ў ліквідацыі пажараў толькі тых будынкаў, якія могуць быць выкарыстаны воінскімі падраздзяленнямі. Ніякія гістарычныя ці мастацкія каштоўнасці на Усходзе не маюць значэння” [3, с. 341].

Усе кірункі акупацыйнай палітыкі ў адносінах да культурных каштоўнасцей яскрава праявіліся ў Беларусі. У першыя дні акупацыі Мінска салдаты і афіцэры вермахта рабавалі музеі, а па загаду рэйхсфюрэра СС з горада была вывезена надзвычай каштоўная калекцыя жывапісных і іншых мастацкіх твораў [4, с. 96]. Прычым СС аддавала вермахту на рабаванне рэшткі таго, што для СС не ўяўляла каштоўнасці. З рапарта ад 26 верасня 1941 г. аб праверцы Беларускага краязнаўчага музея вынікае, што “стан калекцыі запушчаны, доўгі час ніхто не займаўся яе ўпарадкаваннем. У вайну калекцыя панесла вялікія страты... страчана, напрыклад, шабля маршала Ноя. Шмат якія карціны парваныя, а рамы паламаныя...” [10, с. 193]. Камандаванне падраздзяленняў СС і вермахта абсталёўвала свае службовыя кабінеты нарабаванымі шэдэўрамі мастацтва. Асабліва прыкра выглядаў выпадак, калі салдатам у самы апошні момант не далі выкарыстаць на падпал адну з партытур Вагнера, дарэчы, любімага кампазітара фюрэра [5, с. 96].

18 лістапада 1941 г. у Мінску распачаў сваю дзейнасць аператыўны штаб, які падпарадкоўваўся міністэрству ўсходніх тэрыторый на чале з А.Розенбергам. У першую чаргу яго задачай з’яўлялася выяўленне любых твораў мастацтва, што значыла “вынішчэнне культурных здабыткаў на акупіраванай тэрыторыі” [5, с. 97]. У складзе аператыўнага штаба было каля 15 немцаў, з якіх толькі пяць мелі навуковую падрыхтоўку. Колькасць мясцовых супрацоўнікаў дасягнула ў кастрычніку 1943 г. 30 чалавек, з іх 28 жанчын, большасць з якіх працавалі ў бібліятэках, адна піяністка апрацоўвала нотныя матэрыялы [5, с. 97].

Аператыўны штаб разглядаў культурныя каштоўнасці ў Беларусі як трафеі, што павінны забяспечваць патрэбы новых гаспадароў. Аднак калі ў іх былі зацікаўлены

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вышэйшыя інстанцыі, то належала аддаваць іх прадстаўнікам гэтых інстанцый “без сквапнасці”. Напрыклад, на кватэры аднаго з нямецкіх начальнікаў знаходзіліся мэбля і карціны з калекцыі Радзівілаў, а ў прыёмнай вайсковага штаба віселі каштоўныя творы алейнага жывапісу [5, с. 98–99].

Дзейнасць аператыўнага штаба працякала ў вельмі складаных умовах. Нягледзячы на тое, што да восені 1942 г. ён не быў аб’ектам нападаў, яго супрацоўнікі былі вымушаны надаваць увагу мерам бяспекі, напрыклад практыкавацца ў стральбе. Нямецкі даследчык Бернгард К’яры з сарказмам ставіць пытанне аб тым, чым займаліся супрацоўнікі аператыўнага аддзела ў “свой вольны час, калі не былі заняты арганізацыйнымі пытаннямі і праблемамі забеспячэння”. І адказвае, што “штаб сабраў сотні тысяч кніг у розных пазабібліятэчных сховішчах, меў у сваім распараджэнні фільмы, экспанаты з фонду музея і Дзяржаўнай галерэі, а таксама навучальныя матэрыялы” [5, с. 103].

Як усё выглядала на самай справе? Спашлёмся на факты, прыведзеныя Б.К’яры: “...бібліятэка імя Леніна выкарыстоўвалася акупантамі ў якасці склада і халадзільнага сховішча. Каб вызваліць месца, спальвалі частку выданняў<...> Нямецкія афіцэры раз’язджалі каля будынка бібліятэкі на ваенных машынах, каб ... набыць сабе сувеніры. Распродаж культурных экспанатаў можна было назіраць на мінскіх рынках... Пасля атрымання даносу ў канцы 1942 г. паліцыя пачала праверку мясцовых кніжных крам і аказалася, што кнігі – сярод іх каштоўныя энцыклапедыі – амаль выключна паходзілі з публічных бібліятэк і навучальных устаноў” [5, с. 103–104].

Відавочна, што ў такім злачынным бязладдзі гінулі многія культурныя здабыткі. Уражвае гісторыя з фондам Радзівілаў. Як вядома, вялікі фонд асабістых сямейных дакументаў, а таксама прыватная бібліятэка Радзівілаў былі прывезены ў Мінск пасля 1939 г. У першыя тыдні акупацыі шмат якія дакументы былі ўкрадзены, пашкоджаны, выкарыстаны на самакруткі ці на распал або перабраныя ў пошуках старых паштовых марак. Аператыўны штаб спрабаваў адправіць радзівілаўскія каштоўнасці ў Берлін, аднак справа расцягнулася на доўгі час. А між тым збор знаходзіўся ў розных месцах і патроху раскрадаўся, асобныя экзэмпляры паяўляліся ў казармах як чытанне на ноч. Аб крытычным стане фонду Радзівілаў сведчыць той факт, што ў канцы 1942 г. “два грузавікі прывезлі 5 тысяч рукапісаў XVII–XIX стст. мастацкага, царкоўнага, гістарычнага зместу. Другая частка збору была знойдзена ў запушчаным стане ў адным з памяшканняў Акадэміі навук”. На сакавік 1943 г., калі было падрыхтавана месца для калекцыі, яна “пацярпела непапраўныя страты праз тое, што доўгі час ляжала зваленай на падлогу і што на яе трапляла вада з пражавелых труб ацяплення” [5, с. 105]. Толькі ў кастрычніку 1943 г. адбылося размяшчэнне яе на “захаванне”, потым фонд быў вывезены ва Усходнюю Прусію, адтуль пасля вайны яго вярнулі ў Мінск у страшэнным стане. Партрэты былі «без рам, подпісаў, з абсыпанай фарбай, з мноствам механічных пашкоджанняў, з пазначэннямі: “Прынц”, “Кароль”, “Каралевіч”» [10, с. 45]. Работы па рэстаўрацыі дакументаў вяліся больш за 20 гадоў [12, с. 78].

Не лепшы лёс напаткаў і іншыя зборы каштоўнасцей. У кастрычніку 1943 г. упершыню было ўзнята пытанне аб вывазе асабліва важнага “кніжнага матэрыялу ў бяспечныя месцы” [5, с. 108]. Перш за ўсё меліся на ўвазе кнігі з бібліятэк імя Леніна і Акадэміі навук. Вывазу падлягалі самыя каштоўныя экзэмпляры, а рэшткі павінна была атрымаць Беларуская Цэнтральная Рада (БЦР). У выніку яна атрымала ў сваё распараджэнне адзін мільён кніг, выдадзеных да 1917 г. Да лютага 1944 г. у Паўльсгрунд, што пад Ратыборам, быў звезены мільён кніг з савецкай тэрыторыі. Шмат якія найкаштоўнейшыя кнігі з бібліятэк БССР былі яшчэ больш пашкоджаны ў час перавозкі. У Ратыбору кнігі, нотныя зборнікі, карціны траплялі пад дождж. Папяровыя груды парахнелі на чыгуначных перонах і паступова знікалі пад снегам [5, с. 109]. 6 красавіка 1944 г. БЦР атрымала паўнамоцтвы вырашаць усе пытанні, звязаныя з беларускай культурай, і БЦР пагадзілася з вывазам самых каштоўных кніг ва ўсходнепрускі г. Інстэрбург [5, с. 108]. Бернгард К’яры лічыць рашэнне нямецкай улады аб перадачы бібліятэчнай справы на водкуп БЦР “абсурдным прапагандысцкім крокам”, бо ў 1944 г. ужо “адсутнічалі дзве трэці з даваенных трох мільёнаў тамоў” [5, с. 109].

Тым не менш Беларуская Цэнтральная Рада лічыла, што яна здолее зрабіць магчымым ажыццяўленне прадугледжаных мерапрыемстваў па абароне музейных каштоўнасцей,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

“якім пазней будзе забяспечаны паказ па ўсёй беларускай зямлі...”. У праекце пагаднення з дырэктарам Інстэрбургскага музея быў і такі пункт: “Пасля заканчэння вайны захаваныя музейныя каштоўнасці цалкам перадаюцца ў Мінск згодна з пастановай Беларускай Цэнтральнай Рады” [10, с. 195].

Дарэчы, дырэктар музея ў Інстэрбургу В.Гранаў быў знаёмы з аб’ектамі культуры Мінска, таму што ў канцы 1942 г. ён наведаў горад. В.Гранаў пагаджаўся прыняць культурныя каштоўнасці з Беларусі, але вылучаў цікавую ўмову: у першым вагоне з культурнымі каштоўнасцямі добра схаваць, упакаваць, каб не выцекла і не сапсавала знешні выгляд наклеек, скрыню гарэлкі і адзін пакунак папярос. Апіраючыся на свой папярэдні вопыт, ён лічыў, што з дапамогай гэтага можна будзе лёгка “вырашыць знешне цяжкую праблему працоўнай сілы і інш.” [10, с. 198].

У час вайны ахвярамі грабяжу сталі дзяржаўныя музеі ў Гомелі, Слоніме, Навагрудку, Дзяржаўная карцінная галерэя БССР, Музей народных мастацкіх рамёстваў, Мінская карцінная галерэя, Баранавіцкі абласны мастацкі музей. Усяго быў вывезены 11641 экспанат [2, с. 70]. Была разрабавана ці знішчана ўся рэспубліканская сістэма бібліятэк з кніжным фондам 10 млн. экзэмпляраў. Савецкімі войскамі знойдзены каля 600 тыс. тамоў. Цікавы лёс напаткаў бібліятэку Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі, кнігазбор якой складаў каля 600 тыс. кніг. Значная частка фонду, у прыватнасці часопісы, замежная літаратура, былі адабраны нямецкімі прафесарамі, у ліку якіх быў вядомы селекцыянер Баўэр, і адпраўлена ў Германію, астатнія – спалены, а будынак узарваны. Дырэктар гэтай бібліятэкі Д.Р.Новікаў выявіў на тэрыторыі Германіі і ў падвале аднаго з дамоў недалёка ад г. Штутгарта знайшоў некалькі соцень скрынь з музейнымі каштоўнасцямі з Беларусі, кнігі з бібліятэкі Акадэміі навук і сельскагаспадарчай акадэміі [2, с. 68–69].

У рэйх былі вывезены каштоўныя экспанаты з Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР, урон склаў каля 12 млн. залатых рублёў. Сярод вывезенага – прыкладна 1700 экспанатаў рускага і заходнееўрапейскага жывапісу, 30 абразоў XVI–XVII стст., калекцыя слуцкіх паясоў (32 шт.), калекцыя фарфору, гадзіннікаў, каля 100 дываноў і габеленаў і інш. [2, с. 70–88]. З Магілёўскага дзяржаўнага гістарычнага музея былі ўкрадзены залатыя рэчы з раскопак Пампеі, сярэбраная мітра Г.Каніскага, залаты і сярэбраны ключы г. Магілёва, сярэбраная булава Жыгімонта III, калекцыя рукапісных кніг, абразоў і іншае, у цэлым 369 прадметаў [2, с. 119–126].

Пасля вайны ў Мінск вярнуліся 2 вагоны (182 скрыні) каштоўнасцей [7, с. 61].

Усё сказанае вышэй дазваляе сцвярджаць, што культурныя здабыткі народаў, прайграўшых вайну, станавіліся ваеннымі трафеямі пераможцаў, своеасаблівай ахвярай вайны.

На першапачатковых этапах эвалюцыі чалавецтва аб’ектам захопнікаў з’яўляліся матэрыяльныя каштоўнасці. Патрабаваліся стагоддзі дзеля разумення агульначалавечых каштоўнасцей, якія заключаліся ў кнігах, творах мастацтва, дакументах, што з цягам часу ператварыліся ў аб’ект ваеннай палітыкі, яе мэту і ахвяру. У агні вайны гінулі бясцэнныя творы мастацтва, іншыя дасягненні розуму і рук чалавека, тым самым наносілася непапраўная шкода сусветнай культурнай спадчыне.


1. *Бригадина, О.В.* Судьба культурно-исторических ценностей Беларуси: к вопросу о реституции / О.В.Бригадина // Трагічнае лета 1941: напамін гісторыі: матэрыялы Міжнар. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 22 чэрв. 2001 г.: у 2 ч. / гал. рэд. А.А.Каваленя. – Мн.: Мінск. дзярж. лінгв. ун-т, 2001. – Ч. 1. – С. 28–32.

2. *Вяртанне:* дакументы і архіўныя матэрыялы па праблемах пошуку і вяртання нацыянальных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь / Беларускі фонд культуры; рэдкал.: Н.Ф.Высоцкая [і інш.]. – Мн., 1992. – 256 с.

3. *История* второй мировой войны 1939–1945 гг. – Мн.: Воениздат МО СССР, 1975. – 533 с.

4. *Ковальский, В.* Репатриация культурных ценностей в ситуации уступок территории и распада многонациональных государств / В.Ковальский // Рэстытуцыя культурных каштоўнасцей: праблемы вяртання і сумеснага выкарыстання (юрыдычныя, навуковыя і маральныя аспекты): матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 19–20 чэрв. 1997 г. / пад рэд. А.Мальдзіса. – Мн.: Нац. навук.-асвет. цэнтр імя Ф.Скарыны, 1997. – С. 21–53.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. *К’яры, Б.* Штодзённасць за лініяй фронту: акупацыя, калабарацыя і супраціў у Беларусі (1941–1944 гг.) / Б.К’яры; пер. з ням. Л.Баршчэўскага; навук. рэд. Г.Сагановіч. – Мн., 2005. – 390 с.

6. *Мальдзіс, А.* Практыка вяртання культурных каштоўнасцей у Беларусі: еўрапейская норма ці выключэнне з правіл? / А.Мальдзіс // Рэстытуцыя культурных каштоўнасцей: праблемы вяртання і сумеснага выкарыстання (юрыдычныя, навуковыя і маральныя аспекты): матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 19–20 чэрв. 1997 г. / пад рэд. А.Мальдзіса. – Мн.: Нац. навук.-асвет. цэнтр імя Ф.Скарыны, 1997. – С. 237–242.

7. *Никандров, Н.* Проблема выявления культурных ценностей, принадлежащих одной стране и перемещенных на территорию другой страны в годы Второй мировой войны / Н.Никандров // Рэстытуцыя культурных каштоўнасцей: праблемы вяртання і сумеснага выкарыстання (юрыдычныя, навуковыя і маральныя аспекты): матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 19–20 чэрв. 1997 г. / пад рэд. А.Мальдзіса. – Мн.: Нац. навук.-асвет. цэнтр імя Ф.Скарыны, 1997. – С. 58–67.

8. *Соловьев, С.М.* Курс новой истории / С.М.Соловьев. – М.: Астрель: АСТ, 2003. – 542 с.

9. *Ушакова, Т.* Проблема реституции культурных ценностей в Республике Беларусь: международно-правовой аспект / Т.Ушакова // Рэстытуцыя культурных каштоўнасцей: праблемы вяртання і сумеснага выкарыстання (юрыдычныя, навуковыя і маральныя аспекты): матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 19–20 чэрв. 1997 г. / пад рэд. А.Мальдзіса. – Мн.: Нац. навук.-асвет. цэнтр імя Ф.Скарыны, 1997. – С. 86–90.

10. *Х’яры, Б.* Вываз беларускіх каштоўнасцей у Германію / Б.Х’яры // Рэстытуцыя культурных каштоўнасцей: праблемы вяртання і сумеснага выкарыстання (юрыдычныя, навуковыя і маральныя аспекты): матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 19–20 чэрв. 1997 г. / пад рэд. А.Мальдзіса. – Мн.: Нац. навук.-асвет. цэнтр імя Ф.Скарыны, 1997. – С. 193–201.

11. *Шышыгіна-Патоцкая, К.Я.* Скарбы Нясвіжа / К.Я.Шышыгіна-Патоцкая. – Мн.: Полымя, 1993. – 189 с.

12. *Шышыгіна-Патоцкая, К.Я.* Нясвіж і Радзівілы / К.Я.Шышыгіна-Патоцкая. – 3-е выд. – Мн.: Беларусь, 2007. – 240 с.: іл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ